

“Праца на ніве людской”

Уладзімір Еўтух

На зямлі мы толькі рыхтуемся да жыцця, а сапраўднае жыццё, поўнае любові, міру, святасці, дабра, будзе ў нябёсах. Будзем прыкладаць намаганні, каб увайсці ў неба.

1Кар.15:58 *“Дык вось браты мае любасныя, будзьце цвёрдыя, непахісныя, заўсёды майце поспех у справе Гасподняй, ведаючы, што праца ваша не змарнее перад Госпадам”.*

Ic.Нав.13:1 *“І калі Ісус пастарэў, увайшоў у сталы век, Гасподзь сказаў яму: “Ты састарыўся, увайшоў у сталы век, а зямлі браць у спадчыну застаецца яшчэ многа”.*

Наша праца служэння людзям перад Богам ніколі не змарнее, яна мае вялікую сілу Божую і заўсёды будзе з намі. Труд – (старасл.) – слёзы, цяжкасць, хваробы, немач. Няпростае слова. Да грэхападзення гэтае слова не ўжывалася. Бог пасяліў людзей у Эдэмскі сад і жадаў, каб яны захоўвалі і пашыралі яго, каб уся зямля напоўнілася райскім садам.

У нашыя дні некаторыя людзі шукаюць Эдэмскі сад, ведаючы рэкі, што там працякаюць, але не могуць знайсці яго. А ці ёсць ён сёння на зямлі? Гэты сад знаходзіцца сёння ў царкве Госпада нашага Ісуса Хрыста. Мы па вялікай літасці, ласцы і дабрадаці Божай пакліканы ў гэты сад.

Калі першыя людзі аслухаліся Госпада, не пайшлі па Яго запавету, то з’явілася слова “труд”: у слязах, у поце твару твайго будзеш сеяць, нараджаць будзеш цяжка ў немачах.

Труд мае вялікае значэнне ад Госпаду. Мінуць яго немагчыма. Слова Божае гаворыць: “Хто не працуе, той і не еш”. “Вера без працы, без труда, без спраў мёртвая”. А любоў? Гэта вялікі труд. Божая любоў заўсёды накіравана, каб аддаць. А каб аддаць, трэба служыць, прыкласці намаганні.

Царства Божае ад дзён Яна Прадвесніка да сённяшніх дзён бярэцца тымі, хто прыкладае труд, намаганні. Труд у Хрысце – гэта вялікая радасць. Слёзы вашыя абярнуцца ў вялікую радасць. Сеяць будзеце са слязьмі, а жаць – з вялікай радасцю.

Малітва, дабравесце – гэта труд. Няпроста прыкладаць намаганні. Асабліва няпроста, калі ў адказ мы чуем нешта нядобрае. Але не трэба сумаваць аб гэтым.

Часам мы адкажам Госпаду: “Не”, а Ён зірне на нас з літасцю, з любоўю, і ад нашага “не” нічога не застанецца, толькі словы: “Госпадзі, будзь літасцівы да мяне, грэшнага чалавека”.

Калі Бог вёў Ізраіль з Егіпецкага рабства, яны прыйшлі да дзвюх гор: бласлаўленне і праклён. І сказаў Бог: “Калі будзеце слухацца слова Майго, выконваць статуты Мае, правілы, пастановы, то бласлаўлю вас, дзяцей вашых, дзяцей дзяцей вашых. А калі не будзеце выконваць – адыму тое бласлаўленне, што маю для вас”.

Што ў нашыя дні знаходзіцца паміж гэтымі гарамі? Слова Божае кажа: “Шукаў Я ў іх чалавека, хто б стаў у праломе за зямлю гэтую, каб яна не загінула”. Што гэта за чалавек, такі дарагі ў вачах Божых, што Ён бы паслухаў яго? Ад каго нарадзіўся гэты чалавек, што Бог так шануе яго? Хто бацькі яго? Гэты чалавек – Царква Госпада Ісуса Хрыста.

Бог шукае праведніка, чалавека, які нарадзіўся ад Яго, і пасылае нас да людзей.

У Беларусі мы маем шмат солі. Але яна залягае на глыбіні 400-800 метраў. Яе трэба падняць адтуль, запакаваць і развезці людзям. Мы, як хрысціяне, маем соль нябесную, святло Божае. Бог паклікаў нас у сад Яго, каб дабраславіць і паслаць на дабравесце. Зямлі яшчэ належыць нам узяць шмат. Давайце глянем на ніву людскую. Усё, што збудавана па Слову Божаму, устаіць, што не па Слову – не.

Усё Пісанне боганатхнёнае і карыснае, каб паправіць, выкрыць, каб навучыць, каб стаўся чалавек дасканалым ва ўсіх дзеяннях сваіх.

У наш час людзі настолькі ўвайшлі ў мітусню, што часам і нас, веруючых, гэты вір захоплівае. Мы пачалі ўладкоўваць сваё жыццё так, што няма часу прыйці на богаслужэнне.

Гасподзь жыве ў нябёсах, у Свяцілішчы і ў сэрцы пакорлівых і паслухмяных. Мы не бачым вачыма, але Бог прысутнічае сярод нас Духам Святым. Яго святое Слова моцнае нас выратаваць, ацаліць, даць жыццё нам і дзецям нашым.

Нам трэба займацца дабравесцем. Калі людзі не пачуюць пра Хрыста, яны не ўверуюць. Мы павінны думаць пра свой народ, пра сваю зямлю, маліцца, дабравествавать.

Лік.1:1 (Числа) *“Палічы народ па родах, па плямёнах, па каленах, мужскога полу ад дваццаці гадоў і вышэй, здольных весці вайну”.* Маісей палічыў і абвясціў, які лік.

Давайце палічым свой народ у царкве. Колькі ў нас настаўнікаў, якія выкладаюць у школах, у вышэйшых навучальных установах? Колькі ў нас людзей, якія служаць у міліцыі? Колькі юрыстаў? Колькі ў нас моладзі, якая вучыцца ў вышэйшых навучальных установах, тэхнікумах і вучылішчах?

Слова Божае – гэта жыццё! І гэтае Слова мы будзем абвяшчаць на ўсякім месцы ў імя Госпада Ісуса Хрыста. Будзем памятаць, што Ён паўстаў, каб і памерлых уваскрасіць да вечнага жыцця. Хай Хрыстос пройдзе па нашай зямлі і застанецца на ёй на векі вечныя! Хай тут будзе такая колькасць праведнікаў, каб, калі Бог будзе судзіцца з зямлёй, Ён памілаваў нашу зямлю і людзей!

Будзем маліцца, каб абнавіўся народ наш дзеля труда і служэння ў імя Госпада Ісуса Хрыста!

Амін.